УДК 27.94(476)

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ АСПЕКТ БЕЛАРУСКАЙ РЭФАРМАЦЫІ

***Святлана Марозава***
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь*

Разглядаецца роля рэфармацыйнага руху ў станаўленні нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа. Іх архітэктарамі на гэтым этапе з’явіліся Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, а носьбітамі – палітычная і інтэлектуальная эліта, якая звязвала дзяржаўную незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага з незалежнасцю царкоўнай.

Увядзенне нацыянальнай мовы ў кананічную літаратуру (“Катэхізіс” Сымона Буднага, пераклад “Евангелля” Васілём Цяпінскім) спрыялі зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху ў Беларусі. Аднак у далейшым Рэфармацыя арыентавалася пераважна на польскую мову і культуру. Шляхціч-пратэстант В. Цяпінскі першым выступіў на абарону нацыянальнай беларускай культуры, калі яна апынулася ў небяспецы.

У 70–80-я гг. XVI ст. нацыянальна-патрыятычны энтузіязм мясцовых магнатаў і шляхты пачаў згасаць. Без падтрымкі пануючага класа беларуская нацыянальная культура пачала страчваць свае пазіцыі, што адмоўна паўплывала на далейшае духоўнае жыццё Беларусі і замарудзіла развіццё нацыянальнай самасвядомасці.

Нягледзячы на перамогу Контррэфармацыі, выпрацаваныя дзеячамі беларускай Рэфармацыі духоўна-культурныя ідэалы і каштоўнасці так або інакш захаваліся ў грамадскім жыцці і менталітэце беларускага народа (родная мова, культура, адукацыя, веды; ідэя рэлігійна-царкоўнай незалежнасці і інш.)

***Ключавыя словы: Рэфармацыя, Вялікае Княства Літоўскае, палітычная і інтэлектуальная эліта, царкоўна-дзяржаўная незалежнасць, беларуская нацыянальна-патрыятычная традыцыя, беларуская мова, культура, кананічная літаратура, нацыянальная самасвядомасць, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі***

Асноватворныя каштоўнасці быцця беларускага народа, якія кансалідавалі яго ў этнанацыянальную супольнасць і вызначылі яго гістарычную ўнікальнасць, фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў. Адным з найважнейшых этапаў станаўлення нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа было XVI ст. – час грандыёзных змен у духоўным, культурным, эканамічным і палітычным жыцці Беларусі, час вялікіх людзей – дзяржаўных і культурных дзеячаў еўрапейскага ўзроўню, час падзей першараднай важнасці, што кансалідавалі беларусаў як этнас.

Актыўна ішоў распачаты ў XIII ст. працэс фарміравання беларускай народнасці. Складваецца яе самастойная мова са спецыфічнымі фанетычнымі і сінтаксічнымі асаблівасцямі, лексічным складам. У асяроддзі прагрэсіўна настроеных слаёў гараджан, шляхты, духавенства з’яўляецца ўсведамленне прыналежнасці да свайго народа, яго адметнасці. Этнічная самасвядомасць – асноўны паказчык ступені кансалідацыі – праяўляліся ў любві да роднага краю, народа, культуры, у зацікаўленасці іх мінулым і будучым лёсам, у клопаце аб развіцці нацыянальных форм духоўнай культуры.

Ля вытокаў станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, нацыянальна-арыентаванай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі стаяў Францыск Скарына – заснавальнік айчыннай нацыянальна-патрыятычнай традыцыі [1, с. 303; 2, с. 130]. І. С. Дварчанін назваў яго першым свецкім асветнікам з развітым пачуццём самасвядомасці [3, с. 174]. У. У. Агіевіч лічыць Ф. Скарыну прарокам нацыянальнай ідэі [4, с. 24]. Скарынаўская Біблія, па словах В. У. Старасценкі, сімвалізавала нараджэнне суверэннай культуры беларускага народа і пэўна выяўленай нацыянальнай самасвядомасці [5, с. 7].

*Ф. Скарыне належыць вялікая роля ў зацвярджэнні ў грамадскай свядомасці каштоўнасці нацыянальнай культуры і роднай мовы. У прадмовах да кніг Біблії ён выказаў ідэал нацыянальнага жыцця беларусаў, асноўнымі кампанентамі якога з'яўляюцца канкрэтная радзіма* ("слаўны горад Полацк", "месца, дзе зрадзіліся і ўскормлены суть") *і культура народа – яго мова, гісторыя, традыцыі [6, с. 3]. Сярод асноватворных каштоўнасцяў нацыянальнага быцця ён называе патрыятызм, аж да самаахвяраванння, дзейнае служэнне* "агульнаму дабру" *і перш за ўсё дабру свайго народа, любоў да* "народу паспалітага", *клопат аб развіцці айчыннай культуры, асветы, роднай мовы. Сваю патрыятычную канцэпцыю Ф. Скарына сцвярджаў не толькі тэарэтычна, але і практычна. Усім сваім жыццём і нястомнай дзейнасцю ён паказаў узор практычна-дзейснай любві да радзімы і народа, найважнейшым вынікам чаго з'явілася заснаванне айчыннага кнігадрукавання.*

Сваё далейшае развіццё айчынная нацыянальна-патрыятычная традыцыя атрымала ў эпоху Рэфармацыі. Архітэктарамі нацыянальна-грамадзянскай самасвядомасці беларусаў на гэтым этапе з'явіліся Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, а яе носьбітамі былі прадстаўнікі магнатэрыі, духавенства, шляхецкай і гарадской інгелігенцыі – інтэлектуальная і ліберальна настроеная эліта грамадства [5, с. 6]. У сярэдзіне XVI ст. рэфармацыйны рух у Вялікім Княстве Літоўскім набыў агульнадзяржаўны характар. Але ў параўнанні з Заходняй Еўропай ён не ператварыўся ў народны.

Рэфармацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім філосаф С. А. Падокшын лічыць неабходным разглядаць у трох сэнсах: светапоглядным або рэлігійна-філасофскім, грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным [7]. Узнікненне і распаўсюджанне тут моцнага рэфармацыйнага руху ён звязвае з сепаратызмам сацыяльна-палітычнай і інтэлектуальнай эліты Княства. Тое, што яна разарвала з традыцыйнай рэлігіяй, уступіла ў канфлікт з каралеўскай уладай, канстанцінопальскім патрыярхам, рымскай курыяй, заключаецца не ў магнацка-шляхецкім сваволлі, даніне модзе, але ў свядомай грамадзянска-палітычнай пазіцыі. Яна выяўлялася, перш за ўсё, у жаданні захаваць суверэнітэт краіны праз стварэнне самастойнай, нацыянальна-дзяржаўнай царквы, незалежнай ад Рыма і Варшавы, з аднаго боку, а з другога, ад Канстанцінопаля і Масквы [8].

Ініцыятарам рэфармацыйнага руху ў Вялікім Княстве Літоўскім з'яўлялася беларуска-літоўскае панства, якое звязвала царкоўную незалежнасць з незалежнасцю дзяржаўнай [7]. Яно мела велізарныя землеўладанні, значныя фінансавыя сродкі, неабмежаваную палітычную і адміністрацыйную ўладу і было носьбітам антыцэнтралісцкіх, сепаратысцкіх настрояў, незалежніцкіх, патрыятычных ідэй. Сацыяльна-палітычным і эканамічным інтарэсам мясцовай арыстакратыі цалкам адпавядала поўная дзяржаўная самастойнасць ВКЛ.

Лідэрам мясцовай арыстакратыі ў яе незалежніцкіх настроях стаў уплывовы літвінскі палітык, канцлер, віленскі ваявода, староста берасцейскі, ковенскі і шавельскі Мікалай Радзівіл Чорны, у чыіх руках была засяроджана фактычная ўлада ў Княстве. Некаранаваны ўладар ВКЛ, ён меў вялікі аўтарытэт сярод беларускіх магнатаў і шляхты і аказваў моцны ўплыў на караля. Праціўнік аб'яднання з Польшчай Мікалай Радзівіл паслядоўна адстойваў суверэнітэт Княства і намагаўся з дапамогай новай веры ідэалагічна і духоўна абараніць сваю дзяржаву і ад каталіцкай Польшчы, і ад праваслаўнай Масковіі. Пасля зрыву пасяджэння Варшаўсага сойма 1563 г. фракцыяй магнатаў-пратэстантаў на чале з Мікалаем Радзівілам Чорным, што стаяла на пазыцыях незалежнасці Княства, і правалу ёй планаў стварэння саюзнай дзяржавы, на адрас канцлера сталі сыпацца абвінавачванні ў намеры стаць самастойным уладаром Княства і імкненні *"зрабіць з Літвы такую дзяржаву, якая была ў часы Гедзіміна і Альгерда"* [9].

Рух Рэфармацыі кардынальна паўплываў на царкоўна-рэлігійнае, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ВКЛ, пакінуў значны адбітак на жыцці беларускага грамадства. Практычна ўсе знакамітыя дзеячы Беларусі другой паловы XVI ст. (князі Радзівілы, Астафій Валовіч, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі), вядомыя сваёй палітычнай, грамадскай, культурнай дзейнасцю, займалі актыўную пазыцыю ў справе рэформы

царквы. Вернікамі пратэстанцкіх цэркваў з’яўляліся або пад моцным уплывам рэфармацыйнай думкі знаходзіліся Андрэй Волан, Цыпрыян Базылік, Андрэй Рымша, Леў Сапега, Мікалай Крыштаф Дарагастайскі, Саламон Рысінскі і інш. Дзеячы Рэфармацыі зрабілі вялікі ўклад у развіццё сваёй краіны.

Рэфармацыя пакінула глыбокі след у гісторыі і культуры Беларусі. З пратэстантызмам звязана развіццё тут адукацыі, кнігадрукавання, рэлігійна-філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, літаратуры, з’яўленне першых школьных падручнікаў і г. д. Пратэстантызм стымуляваў развіццё адукаванасці грамадства, бо кожны галава сям’і павінен быў умець чытаць Біблію і тлумачыць яе сваім блізкім [7].

Еўрапейская Рэфармацыяй разбурыла адзіную касмапалітычную сістэму каталіцтва і стварыла перадумовы для ўзнікнення нацыянальнай царквы з пропаведдзю і навучаннем на роднай мове. Рэфарматары першымі перакладалі Біблію на родную мову (Д. Уікліф – у Англіі, Я. Гус – у Чэхіі, М. Лютэр – у Германіі, Ф. Скарына – у Беларусі), што адыграла вялікую ролю ў развіцці нацыянальных культур і самасвядомасці [7]. Выданне Бібліі на нацыянальных мовах паўсюль лічыцца галоўнай падзеяй еўрапейскай Рэфармацыі. З улікам таго, што Марцін Лютэр пераклаў Новы Запавет на нямецкую мову толькі ў 1522 г., лагічным будзе дапушчэнне: дык можа наша, беларуская, Рэфармацыя пачалася раней за нямецкую? [10, с. 33].

У Беларусі Рэфармацыя садзейнічала абуджэнню цікавасці да нацыянальнай мовы і спрыяла яе пранікненню ў кананічную літаратуру. Менавіта інтарэсы распаўсюджання рэфармацыйных ідэй выклікалі ўзнікненне першых твораў на беларускай мове. Дзякуючы таму, што Францыск Скарына замацаваў беларускія элементы ў Бібліі, яго паслядоўнікі Сымон Будны і Васіль Цяпінскі больш смела ўжывалі гэту мову ў канфесійнай літаратуры. Дзякуючы настойлівасці беларускіх паноў-пратэстантаў другі і трэці Статуты ВКЛ былі выдадзены не на лацінскай, а на беларускай мове [7].

Заснаваная пад апекай Мікалая Радзівіла Чорнага ў Нясвіжы пратэстанцкая друкарня першая ў Беларусі карысталася кірылічным шрыфтам і для распаўсюджвання рэфармацыйных ідэй сярод насельніцтва выдавала кнігі на старабеларускай мове. Выдадзены Нясвіжскай друкарняй у 1562 г. “Катэхізіс” Сымона Буднага стаў першай кнігай на беларускай мове, надрукаванай на тэрыторыі Беларусі.

Адзін з ідэолагаў і дзеячаў рэфармацыйнага руху ў Беларусі, мысліцель і пісьменнік-публіцыст Васіль Цяпінскі каля 1580 г. выдаў у заснаванай у сваім родавым маёнтку Цяпіне Полацкага ваяводства (цяпер Чашніцкі раён) друкарні “Евангелле” ў перакладзе на беларускую мову. Гэта было першае ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе выданне на беларускай і царкоўнаславянскай мовах самай знакамітай кнігі Новага Запавета.

Уся перакладчыцкая і друкарская дзейнасць Васіля Цяпінскага вялася з патрыятычных пазіцый. Яго дзейнасць спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху на Беларусі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. В. Цяпінскі высока цаніў беларускі народ. Яго асветніцкая праграма была разлічана на абуджэнне актыўнасці, гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа, на ўздым нацыянальнай культуры і ўмацаванне грамадскіх пазіцый беларускай мовы.

Аднак спробы дэмакратычных дзеячаў рэфармацыйнага руху ў Беларусі, што адчулі патрэбу беларускага насельніцтва ў друкаванай кнізе і асвеце на роднай мове, былі спарадычнымі. Амаль усе вядомыя нам рэфармацыйныя старадрукі (за выключэннем двух нясвіжскіх выданняў і “Евангелля” В. Цяпінскага) выйшлі на польскай і лацінскай мовах. На пачатковым этапе Рэфармацыя адыграла відавочную ролю ў развіцці беларускай культуры. Аднак у далейшым яна арыентавалася пераважна на польскую мову і культуру, даволі хуткі і інтэнсіўны працэс засвойвання якіх пачаўся ў 1570-я г.

З Рэфармацыяй звязана фарміраванне нацыянальнай свядомасці. Яе істотныя кампаненты – любоў да роднага краю, да яго культуры, зацікаўленыя адносіны да свайго мінулага, сучаснасці і будучыні, г. зн. патрыятызм. Услед за Ф. Скарынай і М. Гусоўскім нацыянальна-патрыятычны пафас надзвычай ярка праявіўся ў творчасці С. Буднага і



Рэпазіторый ПолесГУ

В. Цяпінскага. Пратэстанцкі нясвіжскі «Катэхізіс» 1562 г. заклікаў беларускае панства і шляхту, у прыватнасці, маладых Радзівілаў, каб яны *«не только в чужоземных языцех кохали, але бы ся тежь ... и того здавна славного языка словенского розмиловати и оным ся бавити рачили. Слушная бо речь ест, абы ваши милости того народу язык миловати рачили, в котором давные предки и их княжацкие милости панове отци ваших милости славне преднейшие преложеньства несуть»* [11, с. 24].

Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці адлюстроўовае літаратурная спадчына В. Цяпінскага. Ужо ў 1580-х гг. ён востра адчуў небяспеку для духоўнай культуры беларускага народа, звязаную з паланізатарскімі тэндэнцыямі. В. Цяпінскі засведчыў пачатак дэнацыяналізацыі, адчужэння значнай часткі свецкай і рэлігійнай эліты ад роднай мовы, культурнай традыцыі беларусаў. Ён пафасна, хоць і дыпламатычна, выкрыў яе рэнегацтва, асудзіў тых, хто выракся роднай мовы: *“.. хто бы не мусил плакати, видечи так великих княжат, таких панов значных, так много деток невинных, мужов з жонами в таком зацном русском, а звлаща перед тым довстипном, учоном народе езыка своего славного занедбане, а просто взгарду, ... же вжо некоторие и писмом се своим, а звлаща в слове божем, встыдают?!”* [12]. Гэту крытыку не маглі ігнараваць вярхі дзяржавы і царквы, бо пісьменнік звяртаўся да іх сумлення ў сакральнай кнізе – Евангеллі [13, с. 272].

Шляхціч-пратэстант В. Цяпінскі першым выступіў на абарону нацыянальнай беларускай культуры, калі яна апынулася ў небяспецы, – ён кінуў у твар беларускаму панству абвінавачанне ў *“занядбанні своего славного езыка”* [2, с. 239] . У прадмове да “Евангелля” В. Цяпінскі сцвярджаў, што былая слава беларускага народа згасла па віне духоўных і свецкіх феадалаў, якія грэбавалі роднай мовай. Абарона нацыянальнай мовы і культуры, ідэя служэння радзіме, як асноўнай мэце чалавечага жыцця, зрабілі яго прадмову да “Евангелля” адным з лепшых узораў беларускай патрыятычнай публіцыстыкі. В. Цяпінскі з’яўляўся адзіным у той час прадстаўніком пануючага класа, які абараняў нацыянальную мову і культуру. Ён разлічваў найперш на адукаваных і патрыятычна настроеных беларускіх феадалаў, якіх пераконваў стаць на чале нацыянальна-культурнага руху, паслужыць прыкладам для простага народа [2, с. 241].

У творчасці С. Буднага і В. Цяпінскага патрыятызм абвяшчаецца самай высокай грамадзянскай дабрачыннасцю; родная мова, нацыянальная гісторыя і традыцыі прызнаюцца вядучымі атрыбутамі духоўнай культуры, а праблемы ўратавання нацыянальнай мовы і культуры, якія паўсталі перад грамадствам, усведамляліся як “нацыянальныя задачы” [2, с. 249].

Распачаты ад Ф. Скарыны нацыянальна-культурны рух спачатку сустрэў спрыяльныя адносіны і падтрымку мясцовых магнатаў і шляхты, асабліва ў перыяд інтэнсіўнага распаўсюджвання Рэфармацыі, з якой многія з іх звязалі свае сацыяльна-палітычныя і інтэлектуальныя памкненні. Аднак у 70–80-я гг. XVI ст. уласцівы многім буйным беларускім феадалам нацыянальна-патрыятычны энтузіязм пачаў рэзка згасаць. Ва ўмовах пагаршэння ўзаемаадносін з Маскоўскай дзяржавай, сацыяльна-палітычнага збліжэння з польскімі феадаламі, усё большага ўцягвання ў сферу польскай культуры і далейшай арыентацыі рэфармацыйнага руху пераважна на польскую мову і культуру звужаецца сацыяльная аснова ўласна беларускай культуры. Верхнія пласты грамадства Княства, якія прынялі Рэфармацыю, аказаліся найбольш схільнымі да паланізацыйных працэсаў, якія Рэфармацыя ў пэўнай ступені інтэнсіфікавала [14]. Феадалы Беларусі пераставалі спрыяць беларускаму нацыянальна-культурнаму руху, здрадзілі яму і сталі праваднікамі антыпатрыятычнай, дэнацыяналізатарскай палітыкі. З другой паловы XVI ст. беларуская мова, якая да таго часу дасягнула значнага развіцця, паступова пачала здаваць свае пазіцыі і выцясняцца ў дзяржаўных установах, грамадскім жыцці, пісьменнасці мовамі польскай і лацінскай.

Страціўшы падтрымку пануючага класа, беларуская нацыянальная культура не змагла ўтрымаць сваіх пазіцый на многіх узроўнях. Адчужэнне свецкай і рэлігійнай эліты ад культурных і моўных традыцый беларусаў адмоўна паўплывала на далейшае духоўнае жыццё Беларусі, замарудзіла развіццё нацыянальнай самасвядомасці. Захавальнікам

беларускай мовы стаў просты народ, які змог зберагчы яе ва ўмовах шматвяковай сацыяльнай эксплуатацыі і нацыянальнага прыгнёту.

Так энергічна распачатая спроба зрабіць пратэстанцкую царкву нацыянальна-дзяржаўнай царквой ВКЛ не была да канца паспяховай, хоць у другой палове XVI ст. і склалася арганізацыйная і тэрытарыяльная структура кальвінісцкай царквы: была ўтвораны Літоўская правінцыя, шэсць дыстрыктаў з суперінтэндантамі на чале, праводзіліся партыкулярныя (па дыстрыктах) і правінцыйныя (усіх абшчын Вялікага Княства Літоўскага) сіноды. Сказалася адсутнасць пэўнага кансалідуючага цэнтра або асобы, як гэта было ў Германіі або Швейцарыі; слабое распаўсюджанне Рэфармацыі сярод простага насельніцтва.

Ня гледзячы на тое, што ўрэшце перамагла Контррэфармацыя, духоўна-культурныя вынікі Рэфармацыі так або інакш захаваліся ў грамадскім жыцці і менталітэце беларускага народа. Не страціла сваёй каштоўнасці ідэя рэлігійна-царкоўнай незалежнасці [10, с. 37–38].

Захавалі сваю актуальнасць і трывала ўвайшлі ў арсенал сучаснай нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа выпрацаваныя Ф. Скарынай і дзеячамі беларускай Рэфармацыі нацыянальныя ідэалы і кашоўнасці роднай мовы, культуры, адукацыі, ведаў і інш. Нібыта і да нас звяртаўся праз стагоддзі асветнік В. Цяпінскі: нельга, каб назаўсёды зніклі родная мова, прыгожае пісьменства, скарбы продкаў, бо яны – краса і гонар народа. Праз 300 гадоў пасля яго палымянага заклiку ідэя захавання роднай мовы стала цэнтральнай праблемай беларускага нацыянальна-адраджэнцкага руху XIX – пачатку XXI ст.

Рэфармацыя была адным з важнейшых этапаў станаўлення нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа. Некаторыя даследчыкі лічаць, што менавіта Рэфармацыя заклала падмуркі беларускай нацыі. Не выпадкова да падзей і постацяў таго часу мы і сёння звяртаемся ў пошуках сваіх каранёў і ідэнтычнасці.


1. Падокшын, С. А. Спадчына Скарыны і выхаванне гістарычнай, патрыятычнай і інтэрнацыянальнай свядомасці / С. А. Падокшын // Спадчына Скарыны: Зборнік матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986) / Уклад. А. І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 299–304.
2. Падокшын, С. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. Падокшын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 286 с.
3. Дварчанін, І. С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве / І. С. Дварчанін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 187 с.
4. Агіевіч, У. У. Сімволіка гравюры Скарыны / У. У. Агіевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 320 с.
5. Старостенко, В. В. Белорусская мысль XVI–XVII вв. и становление национального самосознания: Автореф. дис. …канд. филос. наук / В. В. Старостенко. – Минск, 2000. – 16 с.
6. Старостенко, В. В. Идеи национального самосознания в белорусской мысли раннего Возрождения / В. В. Старостенко // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. – 2000. – № 4(7). – С. 3–8.
7. Падокшын, С. Рэфармацыя ў Беларусі: сэнс, вынікі, лёс / С. Падокшын // Спадчына. – 2003. – № 1 [Электронны рэсурс] Рэфармацыя ў Беларусі. – Рэжым доступу: http://belreform.org/ref_sens.php. – Дата доступу: 8.12.2019.
8. Падокшын, С. Роздум над Рэфармацыяй у Вялікім Княстве Літоўскім / С. Падокшын // Матэрыялы канфэрэнцыі "Рэфармацыя й Залаты Век Беларусі" Менск, 1 чэрвеня 2002 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://belreform.org/conf/conf_padoksh.php. – Дата доступу: 8.12.2019.
9. Варыкіш, А. Некаранаваны кароль Беларусі / А. Варыкіш [Электронны рэсурс] // Рэфармацыя ў Беларусі. – Рэжым доступу: http://belreform.org/radz.php. – Дата доступу: 8.12.2019.
10. Вашчанка, А. П. Рэфармацыя як спроба стварэння нацыянальнай царквы на Беларусі / А. П. Вашчанка // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць (матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 19–20 лістапада 2009 г.): да 380-годдзя Сімяона Полацкага / укладальнікі: А. У. Шумовіч, В. А. Шульчанка. – Полацк, 2010. – С. 31–39.
11. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 309 с.
12. Прадмова да Эвангельля [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://belreform.org/zap.php. – Дата доступу: 8.12.2019.

13. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1: Даўняя літаратура XI – першай паловы XVIII стагоддзя. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 910 с.
14. Іванова, Л. З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукаваньня ў Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII стст.) / Л. Іванова [Электронны рэсурс] // Рэфармацыя ў Беларусі. – Рэжым доступу: http://belreform.org/ivanova.php/. – Дата доступу: 8.12.2019.

## NATIONAL-PATRIOTIC ASPECT OF BELARUSSIAN REFORMATION

***Sviatlana V. Marozava***
*dr. hab., professor, Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus*
s_maro@tut.by

**Summary:** It is examines the role of the Reformation in the development of national culture and identity of the Belarusian people. Their architects at this stage appeared Simon Budny and Vasil Tyapinsky and its carriers were the magnates - political and intellectual elite, which linked the state independence of the Grand Duchy of Lithuania with church independence.

The introduction of the national language into canonic literature ("Catechism" of S. Budny, "The Gospell", translated by V. Tiapinsky) encouraged the birth, rise and consolidation of a broad national-cultural and patriotic movement in Belarus. However the further Reformation has oriented predominantly on Polish culture i language. Nobleman-protestant V. Tyapinsky was the first to defend the national Belarusian culture, when it was in danger.

In the 70-80th of the XVI century national-patriotic enthusiasm of local magnates and gentry began to fade. Without the support of the ruling class the Belarusian national culture began to lose its positions, that negatively affected the future spiritual life of Belarus and braked the development of national consciousness.

Despite the victory of the Counter-Reformation, spiritual and cultural ideals and values, developed by leaders of the Belarusian Reformation, survived in public life and mentality of the Belarusian people (native language, culture, education, the knowledge, the idea of religious-ecclesiastical independence)

***Keywords: Reformation, Grand Duchy of Lithuania, political and intellectual elite, church-state independence, Belarusian national-patriotic tradition, Belarusian language, culture, canonical literature, national consciousness, Simon Budny, Vasil Tyapinsky***

Репозиторий ПолесГУ